МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ
ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ МАКСІМА ТАНКА

МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ “XV ТАНКАЎСКІЯ ЧЫТАННІ”, ПРЫСВЕЧАНАЯ ГОДУ БЕЛАРУСКАЙ ЖАНЧЫНЫ



Паважаныя калегі!

Кафедра беларускай і замежнай літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка запрашае Вас прыняць удзел у Міжнароднай навуковай канферэнцыі “XV Танкаўскія чытанні”, прысвечанай Году беларускай жанчыны.

18 верасня 2026 г.

Філалагічны факультэт БДПУ,
вул. Савецкая, 18, г. Мінск,
Беларусь

Кантакты:

+375 29 259 12 58
+375 17 311 22 17
maksimtank1912@gmail.com

Ірына Мікалаеўна Мішчанчук,
загадчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры БДПУ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

Праблемнае поле

- **Творчасць Максіма Танка: нацыянальны, еўрапейскі, сусветны літаратурны кантэкст;**
- **Новыя аспекты рэцэпцыі творчасці Максіма Танка;**
- **Паэтыка твораў Максіма Танка: традыцыі і наватарства;**
- **Лінгвістычныя аспекты асэнсавання спадчыны Максіма Танка;**
- **Сучасныя літаратуразнаўчыя і лінгвістычныя даследаванні: міждысцыплінарны дыялог (культуралогія, гісторыя, філасофія, методыка);**
- **Нацыянальна-культурны, літаратуразнаўчы і лінгвістычны кампаненты сучаснай адукацыйнай прасторы: выклікі і перспектывы;**
- **Беларуская і сусветная літаратуры на мяжы тысячагоддзяў: традыцыі і вектары развіцця;**
- **Кампаратывістыка як інструмент сучаснага літаратуразнаўчага аналізу: беларуская літаратура ў міжкультурным дыялогу;**
- **Мова і міжкультурныя камунікацыі;**
- **Функцыянальная граматнасць і лічбавыя інструменты навучання як асноўныя напрамкі сучаснай адукацыі;**
- **Жанчына ў беларускай і сусветнай літаратуры: культурны кантэкст.**

Арганізацыйны ўзнос для ўдзелу ў канферэнцыі складае 15 беларускіх рублёў, для ўдзельнікаў з іншых краін – 5 $. Рэквізіты для аплаты ўказаныя ў дадзеным інфармацыйным лісце. Копію квітанцыі аб аплаце просім даслаць да 10.09.2026 на электронную пошту maksimtank1912@gmail.com.

Выдаткі, звязаныя з удзелам у канферэнцыі (праезд, пражыванне, харчаванне), аплачваюць удзельнікі або камандзіруючы бок. Пытаннямі пражывання падчас канферэнцыі ў Мінску ўдзельнікі займаюцца самастойна.

Выданне зборніка матэрыялаў плануецца па выніках канферэнцыі. Электронны зборнік будзе разасланы ўсім удзельнікам на электронныя адрасы, указаныя пры рэгістрацыі.

Рабочыя мовы канферэнцыі:

- **беларуская;**
- **руская;**
- **англійская;**
- **нямецкая;**
- **кітайская.**

Формы ўдзелу ў канферэнцыі:

- **вочная;**
- **завочная.**

Тэрміны асноўных мерапрыемстваў:

- **да 07.09.2026 – анлайн-рэгістрацыя ўдзельнікаў канферэнцыі па спасылцы (https://forms.gle/vpd7GYvThbxG3pWx9);**
- **да 14.09.2026 – рассылка запрашэнняў на электронныя адрасы, указаныя пры анлайн-рэгістрацыі;**
- **да 16.09.2026 – рассылка праграмы канферэнцыі на электронныя адрасы, указаныя пры анлайн-рэгістрацыі;**
- **18.09.2026 – правядзенне канферэнцыі;**
- **да 05.10.2026 – прыём матэрыялаў для ўключэння ў зборнік на электронную пошту maksimtank1912@gmail.com;**
- **да 30.11.2026 – рассылка электроннага зборніка навуковых артыкулаў.**

ПАТРАБАВАННІ ДА МАТЭРЫЯЛАЎ КАНФЕРЭНЦЫІ



Матэрыялы канферэнцыі павінны адпавядаць патрабаванням навуковай навізны і актуальнасці, абгрунтаванасці і практычнай значнасці. Матэрыялы падаюцца ў электронным выглядзе ў фармаце .rtf. Файл з матэрыялам павінен быць названы па прозвішчы аўтара, калі аўтараў некалькі – па прозвішчы першага аўтара. Калі ў Вашай працы выкарыстоўваюцца спецыяльныя шрыфты, просім абавязкова іх выслаць асобным файлам.

Патрабаванні да афармлення тэксту публікацыі

1. Назва артыкула. Параметры: памер шрыфта – 14 кг, напісанне – паўтлустае, прамое, усе літары вялікія, выраўноўванне па цэнтры, без абзаца.

2. Ініцыялы і прозвішча аўтара(-аў). У дужках – горад, краіна. Параметры: памер шрыфта – 12 кг, напісанне – светлае, курсіўнае, выраўноўванне па правым краі.

3. Анатацыя. Анатацыя павінна быць інфарматыўнай, арыгінальнай, змястоўнай, адлюстроўваць асноўны змест артыкула, навізну і вынікі даследавання. Аб'ём анатацыі – 50–70 слоў. Параметры: памер шрыфта – 12 кг, напісанне – светлае, прамое, выраўноўванне – па шырыні, абзацны водступ – 1,25 см. Слова "анатацыя" не дадаваць.

4. Ключавыя словы. У якасці ключавых слоў могуць выкарыстоўвацца як адзіночныя словы, так і словазлучэнні ў назоўным склоне. Рэкамендуемая колькасць ключавых слоў – 5–7, колькасць слоў унутры ключавой фразы – не больш за тры. Пералічваць праз кропку з коскай пасля слоў "Ключавыя словы". Параметры: памер шрыфта – 12 кг, напісанне – светлае, прамое, выраўноўванне – па шырыні, абзацны водступ – 1,25 см.

5. Тэкст артыкула. Аб'ём тэксту артыкула 4–5 старонак фармату А4 камп'ютарнага набору. У тэксце не павінна быць нераскрытых абрэвіятур (за выключэннем агульнаўжывальных). Параметры: памер шрыфта – 14 кг, напісанне – светлае, прамое, выраўноўванне – па шырыні, абзацны водступ – 1,25 см, міжрадковы інтэрвал – адзінарны, палі з усіх бакоў – 2,5 см.

6. Бібліяграфічны спіс. Спасылкі на бібліяграфічныя крыніцы прыводзяцца ў тэксце артыкула ў квадратных дужках [1, с. 3] у парадку цытавання. Кожная крыніца павінна мець свой парадкавы нумар у спісе. Параметры: памер шрыфта – 12 кг, напісанне – светлае, прамое (словазлучэнне Бібліяграфічны спіс: – па цэнтры курсівам, без абзацнага водступу), спіс – выраўноўванне – па шырыні, выступ – 0,63 см, міжрадковы інтэрвал – адзінарны.

Пункты 1–4 пішуцца толькі на мове артыкула.

УВАГА! Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору матэрыялаў для публікацыі. Матэрыялы, якія не адпавядаюць навуковаму ўзроўню і тэматыцы канферэнцыі, афармленыя з парушэннем патрабаванняў, а таксама з выяўленым плагіятам, не прымаюцца да друку ў зборніку і не ўключаюцца ў праграму канферэнцыі.

ПРЫКЛАД АФАРМЛЕННЯ МАТЭРЫЯЛАЎ

НАЗВА АРТЫКУЛА

І.І. Прозвішча (Мінск, Беларусь)

Тэкст анатацыі (50–70 слоў).
Ключавыя словы: слова; слова (5–7).

Тэкст артыкула (4 старонкі). Тэкст артыкула. Тэкст артыкула. Тэкст артыкула. Тэкст артыкула.

Бібліяграфічны спіс:

1. Рагойша, В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах : дапам. / В. Рагойша. – Мн. : Бел. Энц., 2001. – 384 с.
2. Мікуліч, М. Станаўленне творчай індывідуальнасці Максіма Танка і фальклор / М. Мікуліч // Роднае слова. – 2022. – № 9. – С. 24–29.
3. Танк, М. Збор твораў : у 13 т. / М. Танк ; НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мн. : Бел. навука, 2006–2012. – Т. 5 : Вершы (1972–1982). – 2008. – 448 с.
4. Федарцова, Т. М. Беларуская паэзія XX стагоддзя: да праблемы станаўлення і развіцця класічных формаў верша : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.01.01 / Федарцова Тамара Мікалаеўна ; Брэсц. дзярж. ун-т. – Брэст, 2001. – 19 с.
5. Гніламёдаў, У. В. Васіль Зуёнак / У. В. Гніламёдаў // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мн., 1999–2015. – Т. 4. Кн. 1 : 1966–1985 / НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – 2002. – С. 620–644.
6. Давыдава, Г. М. Пераказ як форма экзамену: аналіз зборніка тэкстаў / Г. М. Давыдава // Пісьменнік – мова – стыль : матэрыялы III Міжнар. навук. канф., прысвеч. праф. Ц. П. Ломцеву, Мінск, 21–22 верас. 2023 г. / Бел. дзярж. ун-т ; рэдкал.: М. І. Свістунова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2023. – С. 515–520. – URL: https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/306654/1/515-520.pdf (дата звароту: 20.06.2026).
7. Quack, G. Interview with Kim Stanley Robinson / G. Quack // Art Papers. – URL: https://www.artpapers.org/interview-with-kim-stanley-robinson (date of access: 20.06.2026).

Спіс выкарыстаных крыніц афармляецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК Беларусі. Узор афармлення можна паглядзець па спасылцы (https://vak.gov.by/bibliographicDescription).

РЭКВІЗІТЫ ДЛЯ АПЛАТЫ

1. **Праз сістэму “ЕРИП”**

Адукацыя і развіццё

↓

Вышэйшая адукацыя

↓

Мінск

↓

БДПУ імя М. Танка

↓

Іншыя паслугі

↓

Код паслугі: 5

2. **Праз банк**

р/с BY87BLBB36320100302394001001 БИК BLBBBY2X

УНП 100302394

ЦБУ № 538 ОАО “Белінвестбанк” (г. Мінск, 220036, вул. Каржа, 11А)